# Распараджэнне
# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

5 чэрвеня 2020 г. № 104рп г.Мінск

Аб падтрымцы культуры і мастацтва

1. Зацвердзіць рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (дадаецца).

2. Міністэрству культуры выдзеліць у 2020 годзе са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 3 069 932 рублі на ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з рашэннем, указаным у пункце 1 дадзенага распараджэння.

3. Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў, выдзеленых згодна з пунктам 2 дадзенага распараджэння, ускласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства культуры.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Для правовых актов

10

ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
05.06.2020 № 104рп

РАШЭННЕ

савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

11 сакавіка 2020 г. пратакол № 1 г.Мінск

Выдзеліць:

па хадайніцтве Брэсцкага аблвыканкама Драгічынскаму райвыканкаму на першачарговыя рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на аб'екце "Сядзібна-паркавы ансамбль у в.Закозель Драгічынскага раёна. Рэстаўрацыя капліцы" за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 348 500 рублёў;

па хадайніцтве Гродзенскага аблвыканкама:

Ашмянскаму райвыканкаму на кансервацыю з фрагментарнай рэстаўрацыяй і выкарыстаннем руін былога замка Сапегі з фрагментамі абарончых збудаванняў у аграгарадку Гальшаны Ашмянскага раёна за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 498 000 рублёў;

Смаргонскаму райвыканкаму на кансервацыю і рэстаўрацыю гісторыка-культурнай каштоўнасці – фрагментаў замка XIV стагоддзя ў аграгарадку Крэва Смаргонскага раёна за кошт:

асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 800 000 рублёў;

адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 191 932 рублі;

па хадайніцтве Магілёўскага аблвыканкама Мсціслаўскаму райвыканкаму на правядзенне работ на аб'екце "Кансервацыя касцёла, уваходзячага

ў склад матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі ”2“ – ”Былы калегіум езуітаў (1745 – 1750) – касцёл, кляштарны корпус з сюжэтнымі роспісамі ў інтэр’еры келляў і трапезнай у г.Мсціслаўлі Магілёўскай вобласці“ за кошт:

асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 270 306 рублёў;

адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 919 694 рублі;

дзяржаўнай установе ”Нацыянальная бібліятэка Беларусі“ на набыццё комплексу рукапісных і друкаваных кніжных помнікаў за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 41 500 рублёў.

Старшыня савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва — Н.У.Шарубіна